Весці БДПУ. Серыя 2. 2019. № 2. С. 160–164

УДК 008(=161.3)В. Ластоўскі

# ПРАБЛЕМА ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА

**С. С. Слюсар,**
*аспірант кафедры культуралогіі БДУКМ*

Паступіў у рэдакцыю 30.01.19.

UDC 008(=161.3)В. Ластоўскі

# THE PROBLEM OF THE ETHNO-CULTURAL IDENTITY OF THE BELARUSIAN PEOPLE IN THE WORKS BY VATSLAU LASTOUSKI

**S. Sliusar,**
*Post-Graduate Student of the Department of Cultural Studies, BSUCA*

Received on 30.01.19.

У артыкуле даследуецца праблема этнакультурнай ідэнтыфікацыі беларусаў у творчай спадчыне Вацлава Ластоўскага, якая стала асновай яго «крыўскай» канцэпцыі нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі на пачатку ХХ ст. Акцэнтуецца ўвага на гістарычнай і культурнай памяці беларускага народа, якія з'яўляюцца дамінантамі нацыянальнага самавызначэння. У артыкуле сцвярджаецца, што ў публіцыстычнай, літаратурнай і навуковай дзейнасці В. Ластоўскага сістэмна абгрунтоўваецца самабытнасць беларускай нацыі ў поўным комплексе яе гістарычнага быцця – этнічным, культурным і грамадска-палітычным. У цэнтры ўвагі мысліцеля-адраджэнца была праблема назвы беларускага народа і яго дзяржавы, якая разглядаецца ў гістарычнай рэтраспектыве. Менавіта яе В. Ластоўскі лічыў галоўным фактарам этнакультурнай ідэнтычнасці. Сцвярджаў, што крыніцай этнічнай і моўнай своеасаблівасці з'яўляецца народная культура.

*Ключавыя словы:* этнакультурная ідэнтычнасць, канцэпцыя нацыянальна-культурнага адраджэння, Вацлаў Ластоўскі, Крывія, крыўская канцэпцыя, гістарычная памяць, культурная памяць.

The article reveals the problem of ethno-cultural identity of Belarusians on the example of the works by Vatslau Lastouski. This problem was the basis of the “Krivian” concept of national and cultural revival of Belarus at the beginning of the 20th century. It focuses on the historical and cultural memory of the Belarusian people, who are the dominant national identity. The article states that V. Lastovsky in his journalistic, literary and scientific activities settles the identity of the Belarusian nation in the full range of its historical existence – ethnic, cultural and socio-political. The focus of revivalist thinkers was the problem of the name of the Belarusian people and its government, which is seen in historical perspective. It was that B. Lastouski regarded as the main factor of ethnic and cultural identity. It is argued that the folk culture is the source of the ethnic and linguistic identity.

*Keywords:* ethno-cultural identity, concept of national and cultural revival, Vaclau Lastouski, Kriviia, Krivian theory, historical memory, cultural memory.

Ва ўмовах сучаснай глабалізацыі назіраецца актуалізацыя культуралагічнага асэнсавання вытокаў нацыянальнай гісторыі і культуры. Размыванне этнакультурнай ідэнтычнасці вымушае рэдукцыраванне сэнсаў, закладзеных у гістарычнай памяці народа. Зварот да духоўнай спадчыны Вацлава Ластоўскага, якога па праву называюць беларускім фундаменталістам, дае магчымасць інтэрпрэтаваць раскрыццё азначанай праблемы ў яго творчасці з пазіцый сучаснай сацыякультурнай сітуацыі. Гэта паспрыяе выяўленню ідэй, якія могуць эфектыўна паўплываць на грамадскую свядомасць у сферы культурнага адраджэння і нацыянальнай ідэнтыфікацыі.

Праблематыка этнакультурнай ідэнтыфікацыі беларусаў з'яўляецца адной з самых актуальных у айчыннай гуманітарыстыцы. Яна стала прадметам даследавання ў працах П. У. Церашковіча [1], В. К. Бандарчыка [2], Л. М. Лыча [3], В. Л. Насевіча [4], А. Ю. Латышонка [5], А. Ф. Смалянчука [6], А. К. Краўцэвіча і С. М. Токця [7], Ю. В. Чарняўскай [8] і інш. Сярод замежных даследчыкаў трэба адзначыць Р. Радзіка [9] і П. А. Рудлінга [10]. Аднак спадчына В. Ластоўскага ў дадзеным кантэксце не разглядалася з пазіцый культуралогіі, таму мэта дадзенага артыкула – запоўніць гэты прабел.

На хвалі нацыянальнага ўздыму ў беларускім інтэлектуальным асяроддзі пачатку

ХХ ст. канцэпцыя нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі В. Ластоўскага заслугоўвае асаблівай увагі. Менавіта яна потым будзе дапоўнена і аформлена ў «крыўскую» тэорыю, якая задала інтэнцыю адраджэнскаму руху беларускага народа ў ХХ ст. У сваіх артыкулах, кнігах і літаратурных творах вядомы грамадскі, культурны і палітычны дзеяч паслядоўна абгрунтоўвае права на дзяржаўнае самавызначэнне беларусаў, сцвярджае самабытны характар беларускай нацыі, актуалізуе гісторыка-культурную беларускую суб'ектнасць.

Асноўнай прычынай слабасці беларускага нацыянальнага руху В. Ластоўскі лічыў самаўсведамленне беларусамі сваёй культурна-гістарычнай памяці, без якой немагчыма паўнавартаснае існаванне любога грамадства. Узровень нацыянальнай свядомасці народа таго часу, большую частку якога складалі сяляне, быў на вельмі нізкім узроўні. Для беларусаў пры адсутнасці дзяржаўнасці, культурнай аўтаноміі і нацыянальнай вышэйшай адукацыі на працягу некалькіх стагоддзяў было складана выпрацоўваць адзінае калектыўнае бачанне свайго гістарычнага працэсу.

На пачатку ХХ ст. фарміраванне нацыянальнай культуры адбывалася ва ўмовах існавання некалькіх ідэалагічна проціборчых дактрын. Згодна першай, беларуская культура, як і сам беларускі народ, успрымаліся як частка расійскай культуры і гісторыі (ідэалогія заходнерусізму), па другой беларуская культура была часткай польскай (тэорыя «крэсаў»), трэцяя дактрына сцвярджала самабытнасць беларускай культуры з уласцівымі ёй традыцыямі і спецыфічнымі асаблівасцямі фарміравання і развіцця (нацыянальная ідэя).

В. Ластоўскі ў сваёй публіцыстычнай, літаратурнай і навуковай дзейнасці сістэматычна абгрунтоўваў самабытнасць беларускай нацыі ў поўным комплексе яе гістарычнага быцця – этнічным, культурным і грамадска-палітычным. Крыніцай этнічнай і моўнай своеасаблівасці беларусаў ён бачыў народную культуру: народная гаворка стала асновай фарміравання беларускай літаратурнай мовы, а на фальклорнай аснове пачалі стварацца знакамітыя і значныя творы нацыянальнай літаратуры і мастацтва. Як культурны і грамадска-палітычны дзеяч, В. Ластоўскі імкнуўся інтэграваць беларускую культуру не толькі ў агульнаславянскі кантэкст, але і еўрапейскі, творча спалучыўшы беларускія нацыянальныя традыцыі і еўрапейскія культурныя інавацыі, што бліскуча было зроблена ў першую чаргу ў творчасці М. Багдановіча праз стварэнне разнастайных формаў культуры.

Аналізуючы творчую спадчыну В. Ластоўскага, можна сцвярджаць, што ён, з'яўляючыся адным з ідэолагаў беларускага нацыянальнага рамантызму, быў моўным пурыстам. Менавіта таму вялікую ўвагу надаваў праблеме назваў беларускай дзяржавы і беларускага народа, якую звязваў з нацыянальнай ідэнтычнасцю. Ён першы сярод нацыянальных культурных дзеячаў пачаў свядома выкарыстоўваць назвы «Крывія», «крывічы», «крыўская» мова як агульнанацыянальныя замест «Беларусь», «беларусы» і «беларуская» мова. Гісторык А. Латышонак лічыць, што гэта традыцыя была заклададзена яшчэ ў польскай гістарыяграфіі А. Нарушэвічам, які склаў гістарычную карту, паводле якой практычна ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі насялялі ў старажытнасці менавіта крывічы [11, с. 198].

У адносінах да назваў «крывічы» і «Крывія» як аўтэнтычных В. Ластоўскі меў папярэднікаў, на якіх мог абапірацца. Улічваючы яго дасведчанасць як гісторыка ў крыніцах, якія датычыліся беларускай гісторыі і культуры, можна меркаваць, што ён ведаў пра традыцыю называць насельнікаў, у асноўным Цэнтральнай Беларусі, крывічамі, якія гістарычна мелі асаблівы ўплыў сярод іншых плямён, насяляўшых беларускую тэрыторыю.

Так, фальклярыст і краязнавец Я. Чачот называў беларускую мову «крывіцкай», а беларусаў – «крывіцкім племенем» [12, с. 178–189]. Беларускі этнограф, фальклярыст і краязнавец П. М. Шпілеўскі пісаў, што ў старажытнасці Беларусь насялялі дрыгавічы, палачане і самае шматлікае і галоўнае славянскае племя крывічы [13, с. 98]. Этнограф указваў на першынства беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў, называючы яе крывіцкай. У дачыненні да назвы «Беларусь» П. М. Шпілеўскі лічыў, што нельга ўдакладніць той момант, калі крывіцкая назва тэрыторыі была заменена «именем Белоруссии» [13, с. 101].

Рускі гісторык М. М. Карамзін у «Гісторыі дзяржавы Расійскай» адзначае, што вялікі князь маскоўскі Іван ІІІ, пералічваючы ў сваім тытуле валоданні, называе Вялікае Маскоўскае княства «Белой Россиею» [14, с. 252]. Гісторык Алесь Белы ў сваім даследаванні ўказывае, што назва «Белая Русь» не з'яўляецца выключна беларускім феноменам і на працягу стагоддзяў не азначала адзіны канкрэтны рэгіён [15, с. 183].

Сярод знакамітых паслядоўнікаў В. Ластоўскага неабходна ўзгадаць вядомага навукоўцу

Рэпазіторый БДПУ

і грамадскага дзеяча Я. Станкевіча, які таксама сцвярджаў, што назвы «Беларусь» і «беларусы» штучныя, падаюць беларусаў як частку расійскага народа [16, с. 40–42]. Назва «Беларусь», на яго думку, не мела ніякай прамой сувязі з вытокамі этнасу, а з'яўляецца ў перыяд, калі беларуская дзяржаўнасць была ўжо страчана. Знаходзячыся пад уплывам ідэй В. Ластоўскага, навуковец прапанаваў назву «крывічы» як альтэрнатыву «беларусам».

Тэму вяртання аўтэнтычнай назвы краіны і народа В. Ластоўскі пачынае аргументавана развіваць з 1924 г. у працы «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік». У прадмове да яго аўтар выдзяляе пяць асноўных перыядаў беларускай гісторыі, з якімі звязвае дынаміку нацыянальнага этноніма і нацыянальна-культурнага заняпаду [17].

На думку аўтара, Беларусь-Крывія пачалася ў дахрысціянскія часы як вялікая дзяржава і ахоплівала цэнтральны арэал усходнеславянскага рассялення і летапісную Літву. На першым крыўска-рускім этапе (X–XIII стст.) славянскія землі заваёўваюць варагі-русы, і на крывічоў распаўсюджваюцца назвы «русы» або «Русь». Гэты перыяд – пачатак трагічнага і катастрафічнага лёсу для ўсёй наступнай беларускай гісторыі. Увасабленнем Крывіі на гэтым этапе становіцца полацкі князь Усяслаў Чарадзей, які праводзіў незалежную палітыку. Але полацкія крывічы гістарычна так і не здолелі стварыць магутную дзяржаву.

У другі літоўска-рускі перыяд (XIII ст. – 1569 г.) з'яўляецца новая назва «Літва-Русь». Адбываецца аб'яднанне беларускіх зямель з украінскімі і прыбалтыйскімі, крыўска-руская дынастыя па лініі Рагнеда-Уладзімір змяняецца на літоўскую па лініі князя Альгерда. Акрэсліваецца дэзарыентаванасць нацыянальнай ідэнтыфікацыі: народ цяпер «літвіны» па дзяржаўнай прыналежнасці і «рускія» па рэлігійнай прыналежнасці да праваслаўя. Пасля смерці князя Вітаўта ў 1430 г. заканчваецца ўласная гісторыя Беларусі, а пачынаецца сумесная з Літвой.

Трэці літоўска-польскі перыяд (1569 г. – канец XVIII ст.), калі беларускія землі ўваходзяць у склад Рэчы Паспалітай, В. Ластоўскі лічыць драматычным этапам для ўсёй беларускай культуры, бо народныя масы, праваслаўныя па веравызнанні, разыходзяцца ў самаідэнтыфікацыі з каталіцкай элітай. Пачынаецца працэс дабраахвотнай дэнацыяналізацы эліты, які стаў адным з вызначальных фактараў дальнейшага разбурэння нацыянальнага самаўсведамлення крыўскага народа. Люблінскую ўнію 1569 г. В. Ластоўскі трактуе як трагічны момант для беларускай дзяржаўнасці, якая з гэтага часу знаходзіцца ў стане поўнай залежнасці ад Польшчы.

На чацвёртым расійска-беларускім этапе (канец XVIII ст. – 1905 г.) беларускія землі ўваходзяць у склад Расійскай імперыі. Крыўскі народ атрымоўвае афіцыйную назву «беларусы» – зноў парушаецца фактар самаідэнтыфікацыі. Частка эліты пераходзіць у праваслаўе, адначасова называючы сябе рускімі, а асноўная маса насельніцтва, якую складалі сяляне, атрымоўвае афіцыйную назву беларусы [18, с. 365–366]. Як мяркуе В. Ластоўскі, менавіта ў гэты час складаецца ўяўленне аб беларускім народзе як спецыфічнай «беларуска-мужыцкай» касце цёмных, неадукаваных, нацыянальна і культурна не самавызначыўшыхся людзях.

Пяты этап – перыяд змагання за беларускую дзяржаўнасць (1905 г. – 25.03.1918 г.) – скончыўся абвяшчэннем незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

В. Ластоўскі быў прыхільнікам погляду пра абумоўленасць трагізму нацыянальнай гісторыі па прычыне памежнага становішча тэрыторыі беларускіх земляў. У гэтым ён бачыў адзін з фактараў трагізму нацыянальнай гісторыі. Са спецыфічным геапалітычным становішчам Беларусі паміж Захадам і Усходам В. Ластоўскі звязваў і змену масавай паланізацыі палітыкай русіфікацыі, якая працягвалася да 1905 г., калі разам з іншымі свабодамі, дадзенымі насельніцтву Расійскай імперыі, беларусам было дазволена друкаваць на роднай мове. Інтэрпрэтуючы беларускую гісторыю, ён акрэслівае існаванне польскага і маскоўскага ворага. Вядома, што гэта ідэя ёсць ужо ў першым нумары «Мужыцкай праўды» К. Каліноўскага, дзе пісалася пра «маскалёў» і «паноў», якія забралі вольнасць мужыкоў [19, с. 28].

Менавіта ідэя дзяржаўнасці Беларусі для В. Ластоўскага і іншых беларускіх мысліцелей таго часу з'яўлялася гарантам самастойнага развіцця народа і яго культуры. У выніку гістарычных падзей, якія адбываліся пасля абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі ў сакавіку 1918 г., тэрыторыя Беларусі дзялілася паміж Германіяй, Польшчай і Савецкай Расіяй без прызнання факта існавання беларускай дзяржаўнасці. Сучаснік і ўдзельнік гэтых падзей В. Ластоўскі разумеў ўсю трагічнасць сітуацыі для беларускай нацыі. Сваёй канцэпцыяй ён спрабуе перазапусціць нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі

Рэпазіторый БДПУ

на аснове звароту да фундаментальных каштоўнасцей, з дапамогай якіх імкнуўся пашырыць і ўмацаваць «крыўскую» самасвядомасць. Патрэбна было зноў наладзіць працэс самаідэнтыфікацыі беларусаў праз вяртанне народу гістарычнага названня, абгрунтаваць гістарычнае існаванне дзяржаўнасці. У сваім артыкуле «Аб назовах "Крывія" і "Беларусь"» (1925), В. Ластоўскі зноў канстатуе, што беларусы – гэта адбіццё агульнарускай індывідуальнасці, у той час як крывічы – гэта асобная нацыя са сваёй этнічнай, культурнай, гістарычнай і тэрытарыяльнай адметнасцю [18, с. 386].

Крывія, якая існавала яшчэ да Полацкага княства, становіцца архетыпам беларускай дзяржаўнасці ў канцэпцыі нацыянальна-культурнага адраджэння В. Ластоўскага. Менавіта таму для яго на пачатку XX ст. толькі саманазва «крывіч» з'яўлялася лагічна абгрунтаванай. Бясспрэчнае гістарычнае лідэрства крывічоў, іх нашчадкаў і Полацкага княства як моцнай старажытнай протадзяржавы на беларускіх землях [20, с. 100–101, 106–107] з'явілася падставай для ідэалізацыі гэтага перыяду. В. Ластоўскі закладае ў ідэнтыфікацыйны код беларускай літаратуры матыў велічнага мінулага Беларусі, эпохі «залатога» веку Крывіі [21, с. 78], абгрунтоўвае тэзіс аб неабходнасці зацвердзіць назву «Крывія» на афіцыйным узроўні.

У прадмове да свайго «Расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка» ён пісаў: «Мы Крывічы, а не Русь Літоўская, Варажская ці Маскоўская, Белая ці Чорная… Мы, Крывічы, славянскае асобнае племя, са сваёй асобнай мовай, гісторыяй, народным характарам, звычаямі і абычаямі; племя, якое тысячу з лішнім лет засяляе сваю крывічанскую зямлю… мы цяпер ізноў… адбудоўваема вольную Крывію!» [17, с. XI].

У «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» В. Ластоўскі адзначаў: «Крывія, Русь, Літва – патройны вузел, трохпаверхі лабірынт, у якім блудзіла і дагэтуль блудзіць нашае нацыянальнае "я"» [22, с. 138]. Менавіта стварэнне «Крывіі», якая «глыбока ў народнай сьвядомасьці жыве і пакутуе, чакаючы дня свайго ўваскрэшаньня», павінна была скончыць спрэчкі наконт неабходнасці і правамернасці стварэння незалежнай беларускай нацыянальнай дзяржавы.

У аповесці «Прыгоды Панаса і Тараса» В. Ластоўскі выказвае пазіцыю да паходжання назваў краін: «…Расейцы – у Расіі, немцы – у Нямеччыне, французы – у Францыі, паляке – у Польшчы, крывічэ – у Крывіі. Да крывічоў мы і належым…» [18, с. 45]. Для яго назва краіны лагічна звязваецца з самым магутным і пасіянарным племенем, якое пражывала на пэўнай тэрыторыі. Гістарычна на тэрыторыі сучаснай Беларусі вялікімі пасіянарыямі былі крывічы, таму для В. Ластоўскага назва краіны Крывія становіцца аналагічнай назвам іншых еўрапейскіх дзяржаў.

Як бачна, В. Ластоўскі лічыў, што зварот да назваў «Крывія» і «крывічы» паспрыяе вырашэнню праблемы ідэнтыфікацыі беларусаў як аўтэнтычнай нацыі з тысячагадовай гісторыяй, абгрунтаванню ідэі стварэння незалежнай нацыі-дзяржавы. Ён першы сярод прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху свядома выкарыстаў назвы «Крывія» і «крывічы» як агульнанацыянальныя замест тэрмінаў «Беларусь» і «беларусы», паслядоўна тлумачыў, абгрунтоўваў і прапагандаваў патрэбу ўводу іх у шырокі ўжытак. На думку В. Ластоўскага, новая крыўская ідэнтычнасць павінна была скласці сапраўдную канкурэнцыю ўсім прысутным на той час ідэнтычнасцям: заходнерускай (з апорай на традыцыі Расейскай Імперыі), крэсовай (з апорай на Польшчу), савецкай беларускай (з апорай на БССР).

Такім чынам, назва народа і дзяржавы з'яўляюцца магутным фактарам кансалідацыі грамадства, нагадваючы пра былую веліч, якую магчыма аднавіць, стварыўшы новую ідэалогію. Працэс канструявання беларускай нацыі працягваецца, і ў сучасных умовах актуалізацыя гістарычнай і культурнай спадчыны павінна стаць сродкам умацавання дзяржаўнага суверэнітэту і нацыянальнай свядомасці беларусаў.


*Літаратура*

1. *Терешкович, П. В.* Этническая история Беларуси XIX – начала XX в. в контексте Центрально-Восточной Европы / П. В. Терешкович. – Минск : БГУ, 2004. – 223 с.
2. Этнаграфія беларусаў : гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 213 с. [2] с. : іл.
3. *Лыч, Л.* Беларуская нацыянальная ідэя : тэарэтычны і практычны аспекты / Л. Лыч. – Мінск, 2010. – 448 с.

*References*

1. *Tereshkovich, P. V.* Etnicheskaya istoriya Belarusi XIX – nachala XX v. v kontekste Tsentralno-Vostochnoy Yevropy / P. V. Tereshkovich. – Minsk : BGU, 2004. – 223 s.
2. Etnagrafiya belarusau : gistaryyagrafiya, etnagenez, etnichnaya gistoryya / V. K. Bandarchyk [i insh.]. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1985. – 213 s. [2] s. ; il.
3. *Lych, L.* Belaruskaya natsyyanalnaya ideya : tearetychny i praktychny aspekty / L. Lych. – Minsk, 2010. – 448 s.


Рэпазіторый БДПУ

4. *Насевіч, В. Л.* Беларусы: станаўленне этнасу і нацыянальная ідэя / В. Л. Насевіч. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 526 с.
5. *Латышонак, А.* Нацыянальнасць – Беларус / А. Латышонак ; навук. рэд. А. Пашкевіч. – 3-е выд., папраўленае і дапоўненае. – Смаленск : Інбелкульт, 2017. – 720 с.
6. *Смоленчук, А. Ф.* Белорусская историография второй половины XIX – начала XX века и становление национальной идеологии / А. Ф. Смоленчук // Славяноведение. – 1999. – № 6. – С. 60–67.
7. *Кравцевич, А.* Белорусы: нация Пограничья / А. Кравцевич, А. Смоленчук, С. Токть. – Вильнюс : ЕГУ, 2011. – 212 с.
8. *Чернявская, Ю. В.* Этнокультурная самоидентификация белорусского народа : дис. ... канд. культурологии : 24.00.01 / Ю. В. Чернявская. – Минск, 2002. – 119 с.
9. *Радзік, Р.* Вытокі сучаснай беларускасці. Беларусы на фоне нацыятворчых працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе XIX ст. / Рышард Радзік ; пер. з польск. мовы Н. Дзенісюк ; навук. рэд. С. Рудовіч ; С. Токць. – Мінск : Медысонт, 2012. – 376 с.; *Ён жа.* Вакол ідэнтычнасці беларусаў / Рышард Радзік ; пер. з польск. мовы С. Петрыкевіч ; навук. рэд. Гагановіч. – Мінск : Лімарыус, 2017. – 309 с.
10. *Rudling, P.* The Rise and Fall of Belarusian Nationalism, 1906–1931. / P. Anders Rudling. – Pittsburgh, PA : University of Pittsburgh Press, 2015. – 436 p.
11. *Латышонак, А.* Гутарка «царкоўнага старасты Янкі» з «Яськам гаспадаром з-пад Вільні» / А. Латышонак // Дзеяслоў. – 2004. – № 9. – С. 71–78.
12. *Чачот, Я.* Наваградскі замак: Творы / Я. Чачот ; уклад., пер. польскамоўн. твораў, прадм. і камент. К. Цвіркі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 327 с.
13. *Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Беларусь, 2016. – 272 с.
14. *Карамзин, Н. М.* История государства Российского / Н. М. Карамзин; [обраб. и ред. Ю. Медведев]. – М. : Эксмо, 2009. – 1020, [2] с., [26] л. цв. ил.
15. *Белы, А.* Хроніка Белай Русі : Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы / Алесь Белы. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2000. – 238 с.
16. *Станкевіч, Я.* За родную мову й праўдзівы назоў : выбранае / Я. Станкевіч. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2006. – 741 с.
17. *Ластоўскі, В.* Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік / В. Ластоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 832 с. – [факсім. выд. 1924 г.].
18. *Ластоўскі, В.* Выбраныя творы / В. Ластоўскі ; уклад., прадмова і каментарыі Я. Янушкевіча. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.
19. *Каліноўскі, К.* За нашую вольнасць. Творы, дакументы / К. Каліноўскі ; уклад., прадм., пaслясл. і камент. Г. Кісялёва. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1999. – 459 с., [2] л. іл.
20. *Штыхаў, Г.* Крывічы : па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Г. Штыхаў / пад рэд. М. А. Ткачова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 191 с.
21. *Мельнікава, А.* Праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці ў публіцыстыцы Вацлава Ластоўскага / А. Мельнікава // ActaAlbaruthenica / Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego. – 2012. – Т. 12. – С. 75–87.
22. *Ластоўскі, В.* Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі / В. Ластоўскі ; прадм. А. Сушы. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 814 с.

4. *Nasevich, V. L.* Belarusy: stanaulenne etnasu i natsyyanalnaya ideya / V. L. Nasevich. – Smalensk : Inbelkult, 2015. – 526 s.
5. *Latyshonak, A.* Natsyyanalnasts – Belarus / A. Latyshonak ; navuk. red. A. Pashkevich. – 3-ye vyd., papraulenaye i dapounenaye. – Smalensk : Inbelkult, 2017. – 720 s.
6. *Smolenchuk, A. F.* Belorusskaya istoriografiya vtoroy poloviny XIX – nachala XX veka i stanovleniye natsionalnoy ideologii / A. F. Smolenchuk // Slavyanovedeniye. – 1999. – № 6. – S. 60–67.
7. *Kravtsevich, A.* Belorusy: natsiya Pogranichya / A. Kravtsevich, A. Smolenchuk, S. Tokt. – Vilnyus : YeGU, 2011. – 212 s.
8. *Chernyavskaya, Yu. V/* Etnokulturnaya samoidentifikatsiya belorusskogo naroda : dis. ... kand. kulturologii : 24.00.01 / Yu. V. Chernyavskaya. – Minsk, 2002. – 119 s.
9. *Radzik, R.* Vytoki suchasnay belaruskastsi. Belarusy na fone natsyyavytvorchykh pratsesau u Tsentralna-Uskhodnyay Yeurope XIX st. / Ryshard Radzik : per. z polsk. movy N. Dzeisyuk ; navuk. red. S. Ruovich ; S. Tokts. – Minsk : Medysont, 2012. – 376 s.; *Yon zha.* Vakol identychnastsi belrusau / Ryshard Radzik ; per. z polsk. movy S. Petrykevich ; navuk. red. Gaganovich. – Minsk : Lima-ryus, 2017. – 309 s.
10. *Rudling, P.* The Rise and Fall of Belarusian Nationalism, 1906–1931. / P. Anders Rudling. – Pittsburgh, PA : University of Pittsburgh Press, 2015. – 436 p.
11. *Latyshonak, A.* Gutarka “tsarkounaga starasty Yanki” z “Yaskam gaspadarom z-pad Vilni” / A. Latyshonak // Dzeyaslou. – 2004. - № 9. – S. 71-78.
12. *Chachot, Ya.* Navagradski zamak: Tvory / Ya. Chachot ; uklad., per. polskamoun. tvorau, pradm. i kament. K. Tsvirki. – Minsk : Mastatskaya litaratura, 1989. – 327 s.
13. *Shpilevskiy, P. M.* Puteshestviye po Polesyu i belorusskomu krayu / P. M. Shpilevskiy. – Minsk: Belarus, 2016. – 272 s.
14. *Karamzin, N. M.* Istoriya gosudarstva Rossiyskogo / N. M. Karamzin; [obrab. i red. Yu. Medvedev]. – M. : Eksmo, 2009. – 1020, [2] s., [26] l. tsv. il.
15. *Bely, A.* Khronika Belay Rusi : Narys gistoryi adnoy geagrafichnay nazvy / Ales Bely. – Minsk : Entsyklapedyks, 2000. – 238 s.
16. *Stankevich, Ya.* Za rodnuyu movu i praudzivy nazou : vybranaye / Ya. Stankevich. – Vilnya : Instytut belarusistyki, 2006. – 741 s.
17. *Lastouski, V.* Padruchny rasiyska-kryuski (belaruski) slounik / V. Lastouski. – Minsk : Navuka i tkhnika, 1991. – 832 s. – [faksim. vyd. 1924 g.].
18. *Lastouski, V.* Vybranyya tvory / V. Lastouski ; uklad., pradmova i kamentaryi Ya. Yanushkevicha. – Minsk : Belaruski knigazbor, 1997. – 512 s.
19. *Kalinouski, K.* Za nashu volnasts. Tvory, dakumenty / K. Kalinouski ; uklad., pradm., paslyasl. i kament. G. Kisyalyova. – Minsk : Belaruski knigazbor, 1999. – 191 s.
20. *Shtykhau, G.* Kryvichy : pa materyyalakh raskopak kurganou u Paunochnay Belarusi / G. Shtykhau / pad red. M. A. Tkachova. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1992. – 191 s.
21. *Melnikava, A.* Prablemy natsyyanalnay identychnastsi u publitsystytsy Vatslava Lastouskaga / A. Melnikava // ActaAlbaruthenica / Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego. – 2012. – T. 12. – S. 75–87.
22. *Lastouski, V.* Gistoryya belaruskay (kryuskay) knigi / V. Lastouski ; pradm. A. Sushy. – Minsk : Mast. lit., 2012. – 814 s.


Рэпазіторый БДПУ